# ПОРЦЫЯ ЗДАРОЎЯ І ПРЫЕМНЫ БОНУС

## Новы сацыяльны аб'ект, першы такі ў краіне, адкрыўся ў Веткаўскім раёне

**Жыхары аграгарадка Хальч Веткаўскага раёна змогуць цяпер сваім прыкладам паказаць, як у сельскай мясцовасці імкнуцца сачыць за здароўем. Тут пачаў работу першы ў краіне пункт здароўя. Ён адкрыўся на базе фельчарска-акушэрскага пункта. Практыку плануюць распаўсюджваць і ў іншых рэгіёнах краіны.**

Хальч — самы буйны сельскі населены пункт Веткаўскага раёна. Тут практычна паўтары тысячы насельніцтва, трэцяя частка жыхароў — пажылыя людзі. **Старшыня Хальчанскага сельвыканкама Валерый ЖОЛУДЗЕЎ** ад імя ўсіх жыхароў падзякаваў за тое, што пункт здароўя адкрыты менавіта тут, у Хальчы. Важнасць аб'екта цяжка пераацаніць. Гэта прыклад таго, як праводзіць вольны час з карысцю, весці актыўны спосаб жыцця і паляпшаць яго якасць, перакананы кіраўнік сельсавета. А яшчэ наведванне пункта здароўя — крок да шырэння дыспансерызацыі вяскоўцаў.

— Насельніцтва ў нас вельмі актыўнае. Людзі хочуць берагчы сваё здароўе. Вы не ўяўляеце, як яны рады, што менавіта ў іх аграгарадку адкрылі такі пункт, — перадае эмоцыі сваіх пацыентаў **загадчыца Хальчанскага фельчарска-акушэрскага пункта Надзея КОРШЫКАВА**.

Тут можна правесці апаратны масаж, памераць артэрыяльны ціск, вызначыць індэкс масы цела, правесці пульсаксіметрыю.



Вельмі папулярны ў жыхароў аграгарадка кіслародныя кактэйлі. Яны на спецыяльным абсталяванні гатуюцца тут жа.

Між тым, цікавы падобны досвед і ў плане занятасці сельскіх спецыялістаў медзвяна. Так, загадчыца Хальчанскага ФАПа Надзея Сяргееўна ў пункце здароўя дадаткова працаўладкавана на паўстаўкі медыцынскай сястрой. Для медыка гэта дапаўненне да асноўнай зарплаты і дадатковы стымул для работы ў вёсцы ў тым ліку для маладых спецыялістаў, калі такія пункты будуць распаўсюджвацца. Уведзеныя паўстаўкі



аплачваюцца за кошт Беларускага Чырвонага Крыжа.

— Гэта пілотны праект і першы вопыт і ў рэгіёне, і ў краіне, — звярнуў увагу **генеральны сакратар Беларускага Чырвонага Крыжа Дзмітрый ШАЎЦОЎ**. — Сёлета каманда Беларускага Чырвонага Крыжа наведала Ульянаўскую вобласць Расійскай Федэрацыі, дзе мы азнаёміліся з укараненнем падобнага досведу і вырашылі, што яго можна паспрабаваць рэалізаваць у выглядзе пілотнага праекта і ў нас.

Вопыт Гомельскага рэгіёна ў далейшым будзе распаўсюджаны і ў іншых рэгіёнах краіны.

— Мы ўвесь час шукаем новыя формы, якія паляпшаюць якасць жыцця людзей, асабліва на вёсцы. Гэта вельмі важны праект для жыхароў сельскай мясцовасці. Мяркуем, што новыя пункты стануць добрай базай для таго, каб чалавек не толькі мог палепшыць сваё самаадчуванне, але ў цэлым весці здаровы спосаб жыцця, — падкрэсліла **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа Ала СМАЛЯК**.

Сенатар адзначыла, што ініцыятыва, рэалізаваная на Гомельшчыне, узгоднена з Міністэрствам аховы здароўя. Падчас апошняга візіту ў Гомельскую вобласць міністр аховы здароўя адзначыў, што медыцынская служба краіны, безумоўна, зацікаўленая, каб такіх пунктаў здароўя ў рэгіёнах было як мага больш.

— Мы параўнаем, наколькі будуць запатрабаваныя паслугі пунктаў здароўя на прыкладзе Веткаўскага раёна і Рагачова. Прааналізуем, як будуць адгукацца на паслугу людзі. Магчыма, варта сканцэнтраваць такую дапамогу менавіта ў вёсцы, — дадала член Савета Рэспублікі.

Як адзначыла Ала Смаляк, яе асноўная работа кіраўніка абласной арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа і дзейнасць у якасці сенатара шмат у чым пераплятаюцца.

— Падчас прамых тэлефонных ліній і прыёмаў грамадзян жыхары Гомельскай вобласці звяртаюцца з самымі рознымі жыццёвымі пытаннямі. У тым ліку адрасуюць пытанні аказання медыцынскай і рэабілітацыйнай дапамогі. Менавіта работа са зваротамі грамадзян, дапамога людзям у вырашэнні іх надзённых пытанняў, падтрымка ў прадастаўленні выгод сацыяльнай палітыкі — аснова ў рабоце сенатара, — падкрэсліла яна.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

# КАБ ВЕДАЛІ ДЗЕЦІ

## Як у Батчынскім сельсавеце клапоцяцца аб захаванні гістарычнай памяці

**У ваколіцах Кобрына ўсе апошнія вайны пакідалі свае трагічныя адзнакі. Жорсткія баі на тэрыторыі цяперашняга Батчынскага сельсавета адбываліся ў Першую сусветную, у Грамадзянскую, асабліва шмат гора і пакут прынесла апошняя вайна — Другая сусветная. Імёны яе герояў, яе ахвяр адкрываюцца да гэтага часу.**

Літаральна некалькі тыдняў таму на полі за вёскай Паляцічы адкрылі мемарыяльны знак у гонар лётчыка Пятра Шмыгава, які загінуў на трэці дзень вайны. Самалёт паднялі з балота ў 2021 годзе. Дрыгва захавала не толькі фрагменты цела, але і дакументы, нават здымак маці малодшага сяржанта. Таму ўстанавіць асобу пілота, знайсці сваякоў не было складана. Астанкі лётчыка адправілі на радзіму, ва Уладзімірскую вобласць Расіі. А памятны знак урачыста адкрылі сёлета ў дзень горада Кобрына.

— Расходы па вырабе помніка ўзялі на сябе прадпрыемствы горада, — расказвае **старшыня Батчынскага сельскага Савета Святлана ГАНГАЛА**. — А на адкрыццё сабралася шмат людзей, у тым ліку з навакольных вёсак. Усе ведалі пра раскопкі, старажылы і падказалі ў свой час месца, дзе ўпаў самалёт у 1941-м. На цырымоніі адкрыцця былі кіраўнікі раёна, прадстаўнікі грамадскасці, моладзь. Усе разам мы аддалі належнае яшчэ аднаму абаронцу радзімы, імя якога стала вядома.



Сцяпан і Сяргей ВАЛАСЮКІ.

Праз дарогу насупраць знака з абрысамі самалёта стаіць валун з мемарыяльнай дошкай. Яго ўстанавілі па сваёй ініцыятыве і за свой кошт гаспадары тутэйшай аграсядзібы бацька і сын Сцяпан і Сяргей Аласюкі.

— Цяпер мы, паводле дакументаў, жывём у вёсцы Батчы, а ўсе па-ранейшаму называюць нашу мясціну «Сэрэдне». У часы сталыпінскай рэформы людзей адсялялі на хутары, давалі зямлю. Вось і тут утварыўся хутар з некалькіх сем'яў. Пасяленне назвалі «Сярэдняе», па-тутэйшаму «Сэрэдне». Менавіта адсюль у вайну на фронт пайшлі 15 мужчын, у тым ліку мой дзед. Цяпер у дзедаўскай хаце мы абсталявалі аграсядзібу. Гэтыя маляўнічыя мясціны пасярод дубровы прываблівають турыстаў. Аднойчы на паляванні з бацькам заўважылі вось гэты валун, — працягвае Сяргей, — так нарадзілася ідэя прывезці валун, заказаць мемарыяльную дошку і ўвекавечыць памяць усіх сваякоў і землякоў, якія ваявалі. Пазначылі ўсіх: хто вярнуўся і хто не вярнуўся з вайны.

— Гэта наш абавязак перад імі, — падтрымаў сына Сцяпан Паўлавіч. — Зрабіць памятны знак, паводле закона, аказалася не вельмі проста — давялося прайсці шмат узгадненняў, скласці адпаведныя дакументы. Але ўсе этапы паспяхова прайшлі, пліту і валун усталявалі. Цяпер фактычна ўсе нашы госці спыняюцца перад валуном, чытаюць, паказваюць дзецям. На гэта і разлічвалі. А мы даглядаем, падтрымліваем парадак, цяпер возьмем шэфства і над другім помнікам.

— У нас на тэрыторыі ёсць помнік салдатам — воінам Грамадзянскай вайны, ёсць вялікае пахаванне часоў Першай сусветнай. На апошнім і сёння праводзяцца работы па добраўпарадкаванні, рабочы косіць траву, прыбірае тэрыторыю, — кажа Святлана Гангала. — Асаблівы помнік, куды мы прыходзім у гадавіну трагічнай



Старшыня сельвыканкама Святлана ГАНГАЛА каля помніка спаленай вёсцы.

падзеі, у Дзень Перамогі і іншыя памятныя даты, звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной, — мемарыял у памяць пра спаленую вёску Чараваччыцы. Роўна 80 гадоў таму, у 1943 годзе, тут было знішчана 56 жыхароў, спалена 18 дамоў.

— Вялікую краязнаўчую работу праводзіць наша Батчынская школа. У музеі захоўваюцца ўспаміны сведак тых падзей. Дзеці перыядычна ўдзельнічаюць у працоўных дэсантах па навядзенні парадку вакол помніка. Тут мы расказваем школьнікам пра страшную сутнасць вайны, вучым іх цаніць мір як найвялікшую каштоўнасць, — гаворыць кіраўнік мясцовай улады.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 10.431. Нумар падпісаны ў 19.30 15 жніўня 2023 года.**